# Другое прышэсце тарпанаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Паўтары сотні дзікіх коней пакуль агароджаны электрычным дротам — яны знаходзяцца на каранціне пад камерамі і пастаянным наглядам ветэрынараў, але ўжо праз два месяцы змогуць бесперашкодна перамяшчацца па пушчы. Здаецца, гэтых спакойных і прыгожых жывёл, якія часам быццам пазіруюць для фотаздымкаў, вельмі лёгка прыручыць. Але мэту такую заказнік не ставіць. Наадварот, па дамоўленасці з нідэрландскім запаведнікам, што на бязвыплатнай аснове перадаў коней пушчы, гэта нават забаронена, як і падкормліваць жывёл (за выключэннем суровых маразоў), абараняць іх ад драпежнікаў і аказваць ветэрынарную дапамогу.

— Калі мы хоць аднаго каня пачнём выкарыстоўваць у гаспадарчых мэтах, то заплацім штраф у памеры 1000 еўра. І я з такімі ўмовамі цалкам згодны. Гэтыя жывёлы павінны выконваць тую ролю, дзеля якой і прызначаны ў прыродзе, — падкрэслівае **дырэктар заказніка Васіль ГУРКОЎ** *(на фота)*.



А роля іх вельмі цікавая — расчышчаць лугі ад высокай травы і трыснягу, каб іншыя жывёлы (зубры, алені і г. д.) маглі сілкавацца маладой травой на тэрыторыі пушчы і не выходзілі шукаць яе на агароды і калгасныя палі. Прасцей кажучы, конікі будуць выконваць функцыю газонакасілкі. І за тры тыдні статак ужо ачысціў каля 40 гектараў палёў.

— Раней амаль у кожнага была карова, таму тут пасвілі скаціну, нарыхтоўвалі сена. Цяпер у ваколіцах ужо не засталося скаціны, і тыя дзікія жывёлы, якія ёсць у пушчы, не паспяваюць самі расчышчаць сабе тэрыторыі, вось і выходзяць у людзі, — расказаў **начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Мінлясгаса Аляксандр КАЗАРЭЗ.** — А яно як — калі траву ніхто не выядае і не скошвае, то ўтвараецца травяністы дэтрыт, ён перагнойваецца і становіцца непажыўны для жывёл. Акрамя таго, паступова лугі зарастаюць хмызнякамі. Усё гэта прыводзіць да падзення біяразнастайнасці і прадукцыйнасці экасістэм.

Дарэчы, у Беларусі дзікія коні жылі і раней. Вядома, што яшчэ Вітаўт перад Грунвальдскай бітвай у 1409 годзе адлоўліваў тарпанаў на тэрыторыі Налібоцкай пушчы, ды і пасля гэтага іх вельмі часта выкарыстоўвалі ў ваенных мэтах. А пазней гэтых коней пачалі масава знішчаць, бо лічылі шкоднікамі сельскай гаспадаркі. Ад такога моцнага людскога ўціску 400 гадоў таму тарпаны цалкам зніклі з тэрыторыі нашай краіны. А гэта, у сваю чаргу, паўплывала на падзенне папуляцыі зубра, лічаць спецыялісты.

— Гэта другое прышэсце тарпанаў, — адзначыў Васіль Гуркоў. — Хоць іх і нельга назваць чыстакроўнымі. Яны маюць большую частку генаў ад тарпанаў і трохі ад польскага коніка, таму называюцца тарпанападобнымі. Але яны не інвазійныя для нашай краіны, бо тарпаны і раней тут жылі.

Па словах экспертаў, гэтая парода была створана ў 1930 годзе на тэрыторыі польскай часткі Белавежскай пушчы. Вучоныя выходзілі са знешніх прыкмет, бо генетычных аналізаў тады не было. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тарпанападобныя коні трапілі ў Германію, затым вярнуліся ў Польшчу, а пасля «пераехалі» ў Нідэрланды. Нам прапанавалі супрацоўнічаць па такой прыродаахоўнай канцэпцыі, як рэвайлдынг, што значыць паэтапнае аднаўленне характэрных для рэгіёна высокапрадукцыйных экасістэм шляхам вяртання буйных жывёл у месцы іх спрадвечнага арэалу.

— Конікамі ўжо зацікавіліся мясцовыя ваўкі, прыходзіў паглядзець на новых жыхароў і мядзведзь, таму рэгуляваць іх колькасць будзе каму. Але не думайце, што іх тут цяпер усіх з'ядуць. Нягледзячы на свой мірны выгляд, самцы могуць абараніць сваю сям'ю, — адзначыў Аляксандр Казарэз.

Спецыялісты таксама падкрэсліваюць, што конікі дакладна не пачнуць выходзіць за межы пушчы, як, напрыклад, зубры.

— Перад усяленнем тарпанападобных коней у пушчу была праведзена вялікая работа. Мы на працягу двух гадоў вывучалі вопыт Латвіі і Галандыі, дзе такія коні ўжо ёсць. Практыка паказвае, што гэтыя жывёлы прытрымліваюцца сваёй тэрыторыі, яны даволі кансерватыўныя, — падкрэсліў **загадчык лабараторыі папуляцыйнай экалогіі наземных пазваночных і кіравання біярэсурсамі НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, кандыдат біялагічных навук Васіль ШАКУН.** І дадаў, што на аднаго каня патрэбна 1-2 гектары зямлі. У «Налібоцкім» каля 350 гектараў зарослых лугоў. Значыць, пушча можа размясціць 200—300 асобін. Але гадаваць іх тут у вялікай колькасці няма сэнсу. У Беларусі ёсць яшчэ шмат месцаў, дзе можна стварыць новыя папуляцыі. Напрыклад, пойма Прыпяці зарастае, ёсць праблемы і над Дняпром — гэта тыя месцы, дзе раней таксама пасвілі жывёл. Таму, верагодна, хутка конікаў можна будзе сустрэць не толькі ў Налібоцкай пушчы.



**Кацярына ЦІТОВА,**
**фота аўтара.**

**❍ Дарэчы**

**Калі фатаграфавала, заўважыла коніка, які сваім ярка-аранжавым колерам выбіваўся са светла-шэрага табуна. Аказалася, гэты малады жарабец трапіў сюды са сваёй сям'ёй — сем'і наўмысна не разбівалі, каб не ўмешвацца ў асабістыя адносіны жывёл. Цяпер яго плануюць злавіць і аддаць ці на ферму, ці ў заапарк, каб ён не перадаў свае адрозненні іншым членам табуна і не парушыў генафонд.**

---

Надвор'е



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## АПОШНІЯ ДНІ АМАЛЬ ЛЕТНЯГА ЦЯПЛА

### Увесь тыдзень будзе практычна без ападкаў і да плюс 28 градусаў, а ў суботу пахаладае

**Першая палова верасня працягвае нас радаваць практычна жнівеньскім надвор'ем, калі сярэднясутачная тэмпература на 2—4 градусы перавышае кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сіноптыкі адзначаюць, што так цёпла ў першай дэкадзе верасня ў нашай краіне бывае адзін раз на 10—15 гадоў. Сінаптычная сітуацыя застанецца роўнай аж да пятніцы. Цёплыя паветраныя масы будуць уплываць на ўмовы надвор'я, а фон атмасфернага ціску па-ранейшаму застанецца павышаны. Захаваецца воблачнасць, але дажджоў будзе мала. Сёлета ў многіх рэгіёнах краіны адзначаецца дэфіцыт ападкаў. На паўднёвым усходзе краіны захаваецца высокая пажаранебяспека.

У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, удзень будзе 20—26 цяпла, на паўднёвым усходзе — да плюс 28 градусаў.

Камфортнае надвор'е чакаецца і ў чацвер. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўночнаzаходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, удзень у паўночназаходніх раёнах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ад плюс 20 градусаў па паўночным захадзе да 28 градусаў цяпла па паўднёвым усходзе краіны. У пятніцу ўначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе таксама цёпла — плюс 18—25 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 27 цяпла.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у наступныя выхадныя сітуацыя ў атмасферы зменіцца. Спецыялісты заўважылі, што актывізуецца цыкланічная дзейнасць у Паўночнай Атлантыцы. У халодным паветры ўтворыцца цыклон, яго атмасферны фронт, ссоўваючыся цераз нашу краіну, стане адціскаць цёплае паветра за яе межы. Пачнецца пахаладанне. Змены адчуюцца ўжо ўначы ў суботу, тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, месцамі да плюс 14 градусаў. Удзень будзе ад плюс 13 да плюс 18 градусаў, па паўднёвым усходзе — каля 20 цяпла. У нядзелю стане яшчэ больш холадна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

А не шкодзь!

## ЗА НОЧ — 280 КІЛАГРАМАЎ РЫБЫ

**Вось толькі ганарыцца такім уловам жыхар Салігорска не зможа, бо здабыў яго ў Жыткавіцкім раёне незаконна.**

Ранкам у аператыўна-дзяжурную службу Жыткавіцкага РАУС паступіла паведамленне ад супрацоўнікаў вартавой аховы ААТ «Доследны рыбгас Белае» аб тым, што падчас незаконнай лоўлі рыбы з сажалкі быў затрыманы мужчына.

На месцы здарэння праваахоўнікі выявілі 30-гадовага непрацуючага жыхара Салігорска. Пры сабе ў яго былі поліпрапіленавыя мяшкі, у якія была раскладзена выкрадзеная рыба.

Як было ўстаноўлена, мужчына прыехаў да сажалкі напярэдадні ўвечары і расставіў па вадаёме чатыры рыбалоўныя сеткі, кожная працягласцю каля 50 метраў. На працягу ночы яму ўдалося сабраць немалы ўлоў. У агульнай складанасці «рыбак» незаконна прысвоіў 270 кілаграмаў карпа і больш за восем кілаграмаў таўсталобіка, паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Следчым камітэтам па гэтым факце заведзена крымінальная справа за крадзеж. Падазраванаму пагражае пакаранне грамадскімі работамі, або штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**